GREEN EUROPEAN FOUNDATION

# Прынцып ненасілля і падзенне ідэі пацыфізму

**Ненасілле з'яўляецца адным з фундаментальных прынцыпаў еўрапейскіх зялёных. Аднак разуменне гэтага прынцыпу як пацыфісцкага прывяло да нядбайнасці еўрапейскіх зялёных у палітыцы бяспекі, а таксама да ўнутраных канфліктаў. Абмяркоўваючы новае разуменне бяспекі, мы павінны адстойваць прынцып ненасілля і змагацца з тымі, хто яго парушае.**

Адзін з першых пацыфісцкіх рухаў у сучаснай Еўропе нарадзіўся ў Польшчы. Польскія браты, радыкальная галіна пратэстантызму 16-га стагоддзя, супрацьстаялі гвалту, адмаўляючыся насіць мячы і адхіляючы заклікі дзяржавы да зброі. Аднак пацыфізм быў папулярны толькі ў заходняй частцы былога Каралеўства Польскага, якой не пагражалі ўзброеныя канфлікты; ён не меў прыхільнікаў сярод Польскіх братоў у ахопленай войнамі ўсходняй частцы краіны. Калі ў 1571 годзе ў Польшчу прыбыў грэчаскі бежанец Якаў Палеалог, ён пачаў рэзка крытыкаваць пацыфізм Польскіх братоў як абсурдны і неадпаведны часу. Якаў сутыкнуўся з нападамі з іх боку, якія больш засяроджваліся на тым, што ён наносіў шкоду супольнасці, ставячы пад сумнеў яе прынцыпы, чым на лагічных аргументах.

У апошнія гады на еўрапейскіх (маладых) зялёных мерапрыемствах людзі з Усходняй Еўропы, якія спазналі расійскі імпэрыялізм, маглі адчуць сябе згаданым грэцкім мысляром. Супраціўленне заходніх зялёных адпраўцы зброі ва Украіну з-за пацыфісцкіх палітычных праграм або страху эскалацыі было для нас абсурдам. Для нас пацыфізм быў неабароненай пазіцыяй, якая не вытрымлівала канфрантацыі з рэальнасцю, а падзялялі яе толькі людзі з бяспечнага Захаду. Асабліва пасля поўнамаштабнага расійскага ўварвання ва Украіну любыя палітычныя платформы, якія не дазвалялі ўзброіць Украіну, пачалі актыўна шкодзіць і ўспрымацца як састарэлыя.

## Неабходнасць змены праграм

Той факт, што некаторыя нашыя палітычныя праграмы не вытрымалі супрацьстаяння новым глабальным выклікам, павінен быць для нас падставай для роздуму, але, перш за ўсё, гэта павінна быць цікавым выклікам выправіць нашыя маніфесты і зрабіць іх больш сучаснымі. У Польшчы палітычны маніфест Ostra Zieleń, адным з пунктаў якога быў “Пазітыўны мір”, не перашкодзіў нам выходзіць на дэманстрацыі пад лозунгамі “Узбройвай Украіну!” альбо “Закрыйце неба” з лютага 2022 г. Больш за тое, гэта паскорыла працу над нашай новай праграмай, якая прынесла карысць асацыяцыі і руху зялёных у Польшчы.

Ва Ўсходняй Еўропе змена падыходу да арміі і адмовы ад гвалту адбылася ўжо пасля падзення камунізму. Да гэтага адмова ад прызыву ў войска або спальванне вайсковых дакументаў былі добрай тактыкай пасіўнага супраціву аўтарытарным уладам. Аднак пасля падзення камунізму армія стала гарантам бяспекі ў дэмакратычных краінах, а не інструментам у руках савецкага імперыялізму. Такім чынам, пацыфізм не меў сэнсу з 1990-х гадоў і не падзяляўся ніводнай значнай палітычнай сілай.

## Ненасілле застаецца актуальным

Аднак гэта не значыць, што прынцып ненасілля, адзін з фундаментальных прынцыпаў зялёнай ідэалогіі, моцна састарэў. Ненасілле ў вызначэнні зялёных вельмі добра адпавядала выклікам другой паловы дваццатага стагоддзя, паколькі выступала супраць мілітарызму і рэкамендавала засяродзіцца таксама на іншых аспектах бяспекі і пабудовы міру. Негвалтоўнасць азначае, што бяспека не можа вызначацца выключна ў ваенных тэрмінах. Такім чынам, яна павінна ўлічваць іншыя аспекты, такія як эканамічныя, экалагічныя, сацыяльныя і іншыя фактары. Тым не менш, гэта вельмі далёка ад пацыфісцкіх заклікаў да ліквідацыі арміі ці абарончых альянсаў або поўнага ігнаравання абароннай палітыкі ў інфармацыйных кампаніях зялёных. Больш за тое, нягледзячы на тое, што Хартыя еўрапейскіх зялёных выступае за меншую колькасць ваенных умяшанняў, яна дазваляе іх у выпадку неабходнасці: “Зялёныя прызнаюць, што ваенныя сродкі могуць быць выкарыстаны міжнароднай

супольнасцю ў крайнім выпадку. Там, дзе існуе пагроза масавага гвалту супраць грамадзянскага насельніцтва, разгортванне міратворчых ваенных сіл можа быць апраўдана ў якасці стрымлівання. Калі прэвентыўныя меры не даюць выніку, можа спатрэбіцца ўзброенае ўмяшанне". Акрамя таго, міжнародная супольнасць пасля вопыту 1990-х гадоў, г.зн. генацыдаў у Босніі і Руандзе, увяла канцэпцыю адказнасці за абарону (R2P), каб больш ніколі не дапусціць паўтарэння падобных злачынстваў. Хоць гэтая дактрына не апраўдала чаканняў з-за слабасці міжнародных арганізацый, асабліва ААН, яна сімвалізавала змену парадыгмы міжнароднай бяспекі.

Такім чынам, з улікам міжнародных прынцыпаў і прынцыпаў зялёных, не павінна быць дыскусіі аб тым, ці варта нам заклікаць адпраўляць зброю ва Украіну. Пазбаўленне ахвяры магчымасці абараніць сябе нават палягчае дасягненне мэтаў з дапамогай гвалту. Нязгода з гэтым магла быць вынікам не нашых каштоўнасцяў, а нейкіх пацыфісцкіх тэндэнцыяў, на якія мы ніколі не пагаджаліся ў Еўрапейскім зялёным руху. Больш за тое, я лічу, што мы, асабліва маладыя зялёныя, павінны быць больш радыкальнымі і заклік "Закрыць неба" з першых месяцаў вайны быў правільным.

## Нявыкананая патрэба ў дыскусіі

Супрацьстаянне мілітарызму як адзінаму спосабу гарантаваць мір мела адчувальныя наступствы: ваенныя выдаткі ЕС скараціліся з 3,8% ВУП у 1960 г. да 2,03% у 1993 г. Празмерная мілітарызацыя краін ЕС больш не была праблемай. Праблемы, якія ўзніклі, былі адзначаны еўрапейскімі зялёнымі яшчэ ў маніфесце 1994 года: пагроза, якую нясе працяглая расійская ваенная прысутнасць у краінах Балтыі, а таксама няздольнасць ЕС пабудаваць мір падчас канфліктаў на Балканах і Каўказе. Нягледзячы на гэта, працягвалі з'яўляцца антымілітарысцкія патрабаванні, а працягласць раздзелаў палітычных дакументаў аб бяспецы скарачалася. У той час як палітыка бяспекі набыла вырашальнае значэнне ў краінах Усходняй Еўропы, у руху зялёных не было месца для яе абмеркавання.

Адукацыйная сесія "Green Perspectives on European Security" ("Зялёныя перспектывы еўрапейскай бяспекі") стала першай магчымасцю больш шырока зірнуць на тэмы бяспекі і абароны ў агульнаеўрапейскім руху маладых зялёных. "Першая такая магчымасць" звычайна гучыць вельмі добра, але ў дадзеным выпадку такую прастору трэба было арганізаваць раней: альбо падчас іншых мерапрыемстваў, альбо ў інтэрнэце. Тады б падчас мерапрыемства магла ісці гаворка пра дапрацоўку добрай палітычнай праграмы па бяспецы, а не толькі пра пачатак яе працы і ўзгадненне асноўных прынцыпаў. Нашыя высновы, пра якія я распавяду пазней, у прынцыпе адпавядаюць прынцыпу ненасілля. Але спачатку давайце паглядзім на прычыны і вынікі нядбайнасці ў сферы палітыкі бяспекі, перш за ўсё ў кантэксце палітыкі еўрапейскіх зялёных у дачыненні да грамадзянскай вайны ў Сірыі і расійскай агрэсіі ва Усходняй Украіне.

Федэрацыя маладых еўрапейскіх зялёных (FYEG) ніколі не публікавала аніякіх рэзалюцый аб злачынствах рэжыму Асада, толькі аднойчы апублікаваўшы паведамленне пра акцыю салідарнасці з мірнымі ахвярамі наступу на Рыф-Дамаск у сакавіку 2018 года (без згадвання злачынстваў Асада і расійскага ўдзелу). Еўрапейская партыя зялёных (EGP) мела добрую рэзалюцыю па Сірыі ў 2017 годзе (шэсць гадоў вайны і два гады непасрэднага ваеннага ўдзелу Расіі). Гэтая рэзалюцыя не толькі асуджала рэжым Асада, удзел Расіі і адзначала памылкі палітыкі Еўрасаюза ў дачыненні да канфлікту ў Сірыі, але і не выключала (хоць і не на дадзены момант) дапамогі заходніх краінаў ва ўзброеным зварыжэнні дыктатара — па прынцыпе ненасілля. Аднак у 2018 годзе, калі кааліцыя на чале з Захадам нанесла ўдар па фабрыцы хімічнай зброі рэжыму Асада, сустаршыні EGP асудзілі гэта і выступілі за аказанне ціску на Расію і спыненне продажу зброі ў рэгіён. Такі заклік у корані супярэчыў прынцыпу ненасілля, паколькі ён асуджаў любую форму ваеннага супрацьдзеяння міжнароднай супольнасці злачынствам рэжыму Асада, што дазваляла яму працягваць рэалізоўваць сваю палітыку гвалтоўнымі метадамі.

Да 2022 года FYEG таксама не мела рэзалюцыі наконт расійскага ўварвання ва Украіну і толькі адну заяву пра Еўрамайдан, якая была "заклікам да ўсіх бакоў ва Украіне, а таксама за яе межамі, захоўваць спакой і дапамагчы супакоіць сітуацыю", заявіўшы, што нам патрэбны "дыялог, мір і прымірэнне". EGP зноў папрацавала значна лепш, маючы некалькі рэзалюцый у 2014, 2017 і 2018 гадах. Зноў жа, яны

правільна вызначылі пагрозу, то бок расійскую агрэсію. Яны таксама вызначылі кірункі зменаў у еўрапейскай палітыцы, такія як санкцыі або паскарэнне пераходу ад выкапнёвага паліва. Але ніводная з гэтых рэзалюцый не ўключала заклік да ваеннай падтрымкі, у тым ліку да пастаўкі зброі, Украіне, што было не толькі відавочным для краін Усходняй Еўропы, але і адпавядала прынцыпу негвалтоўнасці — бо гэта была адзіная мера, якая магла спыніць палітыку Расіі, заснаваную выключна на гвалце.

## Вяртанне да прынцыпаў

Апошнія два гады і адсутнасць выразнай падтрымкі ваеннай дапамогі Украіне з боку зялёных (усіх краін) Заходняй Еўропы выклікалі шмат канфліктаў у руху. Так быць не павінна, бо мы адстойваем і змагаемся за свае прынцыпы. Мы не стаім пасіўна, калі парушаюцца прынцыпы экалагічнай адказнасці, свабоды, справядлівасці або разнастайнасці. Тое самае трэба зрабіць і з прынцыпам ненасілля. Калі правы чалавека парушаюцца і палітычныя мэты дасягаюцца гвалтоўнымі сродкамі, мы павінны супрацьстаяць гэтаму, выкарыстоўваючы сумяшчальныя сродкі — часам таксама ваенныя.

Праект "Green Perspectives on European Security" (“Зялёныя перспектывы еўрапейскай бяспекі”) даказаў, што нізавыя актывісты разумеюць прынцып ненасілля. Цяпер роля еўрапейскіх зялёных павінна заключацца ў тым, каб пераглядаць палітычныя дакументы і палітыкі і рабіць усе крокі для абароны гэтага прынцыпу ў інстытутах ЕС гэтак жа, як яны абараняюць іншыя прынцыпы Еўрапейскай зялёнай хартыі.

**Ігар Скужыбут**